Багатырова В. В. Адчуць смак студэнцтва / В. В. Багатырова; гутарыла В. Антоненкава // Настаўніцкая газета. – 2024. – 9 крас. – С. 12.

**Адчуць смак студэнцтва**

***ВДУ імя П.М. Машэрава, нягледзячы на свой сталы ўзрост, па-сапраўднаму сучасны як знешне, так і ўнутрана. Нядзіўна, што ён займае высокія пазіцыі ў сусветных рэйтынгах універсітэтаў. Ці лёгка быць адным з лепшых – даведаемся ў рэктара, доктара эканамічных навук, прафесара Валянціны Багатыровай.***



**– Валянціна Васільеўна, ВДУ ўжо больш за 110 гадоў. Які ён сёння?**

– Наш універсітэт – сучасны, але ён захоўвае традыцыі: у нас засталіся ўсе педагагічныя спецыяльнасці. Бо без настаўніка не будзе ні інжынера, ні ўрача, ні ветэрынара, нікога. Ніхто не ўвойдзе ў клас і не навучыць дзяцей лічыць, пісаць і ў цэлым разумець свет. Менавіта настаўнікам даверана самае важнае – навучанне і выхаванне падрастаючага пакалення, а значыць, фарміраванне падмурка моцнай і пасяховай дзяржавы.

Пры гэтым у ВДУ адбылося сур'ёзнае пераўтварэнне, у выніку якога мы прыраслі абсалютна новымі і сучаснымі напрамкамі па біяхіміі і біятэхналогіях, біяэкалогіі (прамысловая экалогія), а таксама па IT-медыцыне, у чым нам дапамагае цеснае ўзаемадзеянне з ВДМУ.

А яшчэ ва ўніверсітэце вялікая ўвага ўдзяляецца выхаваўчай рабоце. Я пераканана: кожны выкладчык мае магчымасці знаходзіць інфармацыю для трансліравання адданасці і павагі да свайго народа, свайго роду і той зямлі, якая дала і дае крылы маладым. Гэта і ёсць аснова пасяховага развіцця нашай установы, аб чым сведчаць і міжнародныя рэйтынгі ўніверсітэтаў. Сёння ВДУ ўпэўнена ўваходзіць у дзясятку найлепшых беларускіх УВА і па Webometrics, і па UniRank, QS Rankings, і нават па Transparent Ranking of Repositories. Але гэта было б немагчымым без зладжанай, шматграннай і прадукцыйнай дзейнасці ўсяго калектыву нашага ўніверсітэта.



**Дэкан ФХБіГН Таццяна Талкачова са студэнткамі.**

**– Калі прадставіць ВДУ ў лічбавым эквіваленце, то што можна адзначыць?**

– У нашым універсітэце высокі навуковы патэнцыял выкладчыкаў: каля 50 % з іх маюць ступені. У нас вельмі вялікая каманда супрацоўнікаў – амаль 1,5 тысячы. Дарэчы, у склад ВДУ ўваходзяць два каледжы – Полацкі і Аршанскі. А яшчэ мы 1 верасня 2022 года адкрылі ліцэй, гэта была мая мара. Я ўпэўнена, што ліцэй прывядзе ва ўніверсітэты рэгіёна матываваных абітурыентаў, якія ў будучыні праслаявяць Віцебшчыну сваімі дасягненнямі.

Адметнасць нашага ліцэя ў тым, што там не працуюць настаўнікі са школы, а толькі выкладчыкі, якія рыхтуюць будучых педагогаў. Ліцэісты, праходзячы навучанне па школьнай праграме, могуць займацца ў сучасных лабараторыях ВДУ і ўдзельнічаць у шматлікіх універсітэцкіх мерапрыемствах поруч са студэнтамі. Яны маюць магчымасць праявіць сябе не толькі ў вучобе, але і ў творчасці, спорце, грамадскай і навуковай дзейнасці. Усё гэта дазваляе ліцэістам у будучыні зрабіць свядомы выбар прафесіі.

*У цяперашні момант навучанне ў Ліцэі ВДУ вядзецца па трох профілях: фізіка-матэматычным, хіміка-біялагічным і гуманітарным. Гэтая ўстанова – адзін з лідараў сярод ліцэяў краіны, што вельмі радуе.*

У кангламерат ВДУ ўваходзяць: універсітэт, два каледжы, ліцэй, інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. У нас вучыцца каля 10 тысяч чалавек на дзённым і завочным аддзяленнях, у магістратуры і аспірантуры. Такім чынам, мы ажыццяўляем усе праграмы навучання, пачынаючы ад агульнай сярэдняй адукацыі да дактарантуры – а значыць, арганізоўваем поўны цыкл падрыхтоўкі спецыяліста.

– **Пераемнасць школы і УВА, у вашым выпадку ліцэя і ўніверсітэта, назіраецца?**

– Безумоўна. Выпускнікі ліцэя будуць паступаць у ВДУ. Дарэчы, сёлета ў ліцэі тры 11-я класы. У іх вучацца 72 вучні, з якіх не менш за 25 ідуць на медаль, і я ўпэўнена, што яны іх атрымаюць. Многія з іх ужо заявілі аб сваім жаданні прадоўжыць навучанне ў нашым універсітэце, бо паступіць яны могуць без іспытаў. Некаторыя вучні класа хіміка-біялагічнага профілю збіраюцца ў ВДМУ. Але тут галоўнае – каб рэгіёны не пусцелі. На гэта накіраваны ўсе навелы прыёмнай кампаніі, якія даюць магчымасць паступіць ва УВА без экзаменаў. Так, юнакі і дзяўчаты – пераможцы міжнародных алімпіяд і рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, творчых конкурсаў і фестываляў, алімпіяд у сферы культуры, пераможцы ўніверсітэцкай алімпіяды, медалісты, а таксама выпускнікі нашых двух каледжаў – могуць стаць машэраўцамі без уступных іспытаў. Усе гэтыя траекторыі накіраваны на тое, каб дзеці разумелі, што яны патрэбны нам, рэгіянальным універсітэтам.

*Настаўнікам даверана самае важнае – навучанне і выхаванне падрастаючага пакалення, а значыць, фарміраванне падмурка моцнай і паспяховай дзяржавы.*




**Дзяніс Кітараў дапамагае студэнтам асвоіць азы робататэхнікі.**

**– А як сёлета прайшла ўніверсітэцкая алімпіяда ў ВДУ?**

– У мінулым годзе мы былі лідарамі па яе правядзенні. У адборы ўдзельнічала больш за 1 тысячу адзінаццацікласнікаў. У выніку з ліку пераможцаў да нас паступілі больш за 70 матываваных абітурыентаў. Сёння я бачу іх зацікаўленыя вочы на 1 курсе.

У гэтым годзе заявак на ўдзел у алімпіядзе было больш, але пераможцаў мы адабралі крыху менш – 155 школьнікаў. Гэта звязана з прыняццем рашэння аб квотах па кожнай спецыяльнасці. Калі раней мы маглі дазволіць такім абітурыентам заняць 15 % месцаў ад лічбаў прыёму, то зараз столькі ж, але ў разрэзе кожнай спецыяльнасці, таму стала крыху менш месцаў.

**– Валянціна Васільеўна, вы не проста кіраўнік, але і выкладчык. Дзеля чаго вы ўваходзіце ў аўдыторыю?**

– Я заўсёды бяру сабе некалькі гадзін лекцый, каб паглядзець на першакурснікаў, сфарміраваць меркаванне пра кожную групу, што потым вельмі дапамагае ў рабоце. Заўсёды абмяркоўваю са студэнтамі на першы погляд простыя прынцыпы жыцця: перш чым заяўляць аб сваіх правах, спачатку заслужыце права гаварыць пра іх, і ў першую чаргу рэкамендую пачаць з абавязкаў. Звяртаю іх увагу на законы жыцця. Так, прынцып бумеранга тлумачу на прыкладзе прымянення ў сваім жыцці законапаслухмянасці. І мяне радуе, што студэнты з ахвотай уключаюцца ў такія размовы.

**– Як выглядаюць лічбы прыёму ў ВДУ ў гэтым годзе?**

– 60 % месцаў адведзена пад бюджэтнае навучанне і 40 % – пад платнае. Набор платнікаў мы скарацілі на 10 %. Сёлета мы чакаем больш за 1 тысячу першакурснікаў на дзённую форму атрымання адукацыі: на бюджэт – 743 і на платнае навучанне – 327. І гэта без уліку замежных студэнтаў, якіх у нас даволі шмат – звыш 1 тысячы чалавек, хоць у 2023 годзе было нават каля 2 тысяч, але адны выпускаюцца, другія прыходзяць, бо цяпер мы набіраем іх круглы год. Зараз у нас вучацца прадстаўнікі 24 краін, больш за ўсё студэнтаў прыязджае з Кітая.

*Усе навелы прыёмнай кампаніі – гэта прарыў для сістэмы адукацыі з пункту гледжання вырашэння найважнейшага пытання – спынення міграцыйнага адтоку.*

Хочацца яшчэ адзначыць, што за апошні час мы адкрылі каля 15 новых праграм як на першай, так і на другой ступені вышэйшай адукацыі, а таксама дзве – па дактарантуры.

У ліку новых спецыяльнасцей – «Мікрабіялогія», першы набор на якую адбыўся ў мінулым годзе на факультэце хіміка-біялагічных і геаграфічных навук, прахадны бал на яе склаў звыш 330 балаў. Увогуле, сёння ў Віцебскай вобласці актыўна развіваецца харчовая і фармацэўтычная прамысловасць, дзейнічае медыка-фармацэўтычны кластар «Саюз "Медыцына і фармацэўтыка" – інавацыйныя праекты», вядзецца работа па стварэнні біятэхналагічнага кластара. Зразумела, што для іх паспяховай дзейнасці неабходны кваліфікаваныя спецыялісты, якіх мы і будзем рыхтаваць на гэтай спецыяльнасці. Дзеля гэтага мы абнавілі і закупілі эксклюзіўнае абсталяванне для лабараторый ПЛР-аналізу і структурна-функцыянальных даследаванняў.

*Ліцэй ВДУ прывядзе ва ўніерсітэты рэгіёна матываваных абітурыентаў, якія ў будучыні праслявяць Віцебшчыну сваімі дасягненнямі.*

Цяпер яшчэ будзем займацца пераабсталяваннем спецыяльнасці «Фізіка». Бо падрыхтоўка па ІТ-профілі немагчыма без фундаментальных ведаў па фізіцы. Таму зараз мая асноўная задача – паставіць на трывалыя ногі «Мікрабіялогію» і «Фізіку».

– **Няхай у вас усё атрымаецца!**

**Вольга АНТОНЕНКАВА.**
**Фота аўтара.**